Рэг. № ____________

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»

Факультэт прынттэхналогій і медыякамунікацый
Кафедра беларускай філалогіі

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| _________________ В.У.Русак | __________________ Т.А.Далгова |
| _________________ 2021 | __________________ 2021 |

ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

для спецыяльнасцей

1-75 01 01 Лясная гаспадарка,
1-75 02 01 Садова-паркавае будаўніцтва

Складальнікі:
Г.Ф. Швед – старшы выкладчык,
В.У. Русак – загадчык кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні
навукова-метадычнага савета _______________ 20___, пратакол № ___

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для студэнтаў спецыяльнасцей 1-75 01 01 «Лясная гаспадарка», 1-75 02 01 «Садова-паркавае будаўніцтва» распрацаваны ў адпаведнасці з артыкулам 94 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, у адпаведнасці з Палажэннем аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі, зацверджаным Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2011 г., № 167, Палажэннем аб электронным вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне, зацверджаным прарэктарам БДТУ па вучэбнай рабоце 21.10.2019 г., у адпаведнасці з вучэбнай праграмай (УД-1422/вуч. ад 01.06.2020).

**Мэты ЭУМК:**

– удасканаленне навукова-метадычнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі;

– арганізацыя самастойнай работы студэнтаў;

– укараненне ў адукацыйны працэс сучасных інфармацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць павышэнне якасці адукацыі;

– фарміраванне інфармацыйна-камунікатыўнага асяроддзя ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу;

– паглыбленае авалоданне беларускай мовай, развіццё маўленчых навыкаў студэнтаў і інш.

**Асаблівасці структуравання і падачы вучэбнага матэрыялу ЭВМК**

Вучэбна-метадычны комплекс уключае раздзелы: тэарэтычны, практычны, кантролю ведаў і дапаможны.

***Тэарэтычны раздзел*** змяшчае вучэбны дапаможнік:

– Русак В.У. Беларуская мова (прафесійная лексіка) [Электронны рэсурс]: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасцей 1-75 01 01 «Лясная гаспадарка», 1-75 02 01, «Садова-паркавае будаўніцтва» / В.У. Русак. – Мінск: БДТУ, 2019. – 238 с.

***Практычны раздзел*** уключае матэрыялы па правядзенні практычных заняткаў – метадычныя ўказанні, пытанні і заданні самакантролю, практычныя заданні, тэксты для перакладу.

***Раздзел кантролю ведаў*** уключае кантрольныя тэсты і пытанні да заліку па вучэбнай дысцыпліне.

***Дапаможны раздзел*** уключае вучэбную праграму установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, кароткі тлумачальны слоўнік тэрмінаў, спіс рэкамендаванай літаратуры.

**Спіс рэкамендаванай літаратуры на папяровым носьбіце**

1. Кузьміч, В.А. Асаблівасці навуковага стылю беларускай мовы ў кантэксце навукова-тэхнічнага перакладу: дапам. / Кузьміч, В.А., Швед, Г.Ф. – Мінск: БДТУ, 2013. – 85 с.

2. Русак, В.У. Беларуская мова (прафесійная лексіка): кароткі тэарэтычны курс і практычныя заданні: вучэб.-метад. дапам. / В.У. Русак. – Мінск: БДТУ, 2017. – 196 с.

3. Русак, В.У. Сучасная беларуская мова: тэорыя і практыкум: дапам. / В.У. Русак. – Мінск: БДТУ, 2014. – 267 с.

4. Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Сацыяльна-гуманітарныя навукі: вучэб. дапам. / М.Р. Прыгодзіч [і інш.]; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча, У.І. Куліковіча. – Мінск: РІВШ, 2015. – 260 с.

5. Граматычны слоўнік дзеяслова / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. В.П. Русак [і інш.]; навук. рэд. В.П. Русак. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2013. – 1252 с.

6. Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя: даведач. выд. / уклад.: В.П. Русак [і інш.]; навук.рэд.: В.П. Русак; НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры [і інш.]. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2013. – 1135 с .

7. Дынаміка літаратурнай нормы сучаснай беларускай мовы, Тэкст, [манаграфія], Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Філіял “Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Колоса і Я. Купалы”; [навук. рэд. д-р філал. навук В.П. Русак] Мінск : Беларуская навука, 2015 . – 439, [1] с.

8. Слоўнік беларускай мовы / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад. Н.П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. А.А. Лукашанец, В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 916 с.

9. Сіўковіч, В.М. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Націск. Словазмяненне. Стылістычныя паметы / В.М. Сіўковіч. – Мінск: Аверсэв, 2012. – 640 с.

Усяго ў склад ЭВМК уключана 1 выданне, 8 вучэбна-метадычных распрацовак, 9 спасылак на рэкамендаваную літаратуру. Фонд ацэначных сродкаў змяшчае больш за 150 пытанняў рознага ўзроўню складанасці па ўсіх раздзелах вучэбнай дысцыпліны.

**Рэкамендацыі па арганізацыі работы з ЭВМК**

ЭВМК можа выкарыстоўвацца пры правядзенні ўсіх відаў заняткаў па вучэбнай дысцыпліне, для бягучага і прамежкавага кантролю ведаў студэнтаў.

| Від работы | Выкарыстоўваемыя элементы ЭВМК |
|---|---|
| Падрыхтоўка да практычных заняткаў | Вучэбны дапаможнік<br>Метадычныя ўказанні<br>Пытанні і заданні да самакантролю<br>Практычныя заданні<br>Тэксты для перакладу<br>Тэксты дыктантаў<br>Кароткі тлумачальны слоўнік тэрмінаў |

| | |
|---|---|
| Падрыхтоўка да заліку | Вучэбны дапаможнік<br>Метадычныя ўказанні<br>Кантрольныя тэсты<br>Кароткі тлумачальны слоўнік тэрмінаў<br>Спіс рэкамендуемай літаратуры<br>Пытанні да заліку |

Работа з ЭВМК садзейнічае ўкараненню сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс, дазваляе арганізаваць рацыянальнае размеркаванне вучэбнага часу па тэмах вучэбнай дысцыпліны і забяспечыць эфектыўную самастойную работу студэнтаў спецыяльнасцей 1-75 01 01 «Лясная гаспадарка», 1-75 02 01 «Садова-паркавае будаўніцтва».

ЭВМК размешчаны ў СДН БДТУ, адрас спасылкі

https://dist.belstu.by/course/view.php?id=2364

Памер ЭУМК 32 Мб.

Старшы выкладчык _______________ Г.Ф.Швед

Дацэнт, канд. філал. навук _______________ В.У.Русак